## Проня, Пронюшка

Бываючы на гэтай рэчцы, наўрад ці хто з вас ведае, чаму менавіта так яна называецца. На гэты конт шмат легенд існуе. Вось адна з іх, якую расказваюць старыя людзі.

Некалі на берагах гэтай ракі размяшчаліся цыганскія табары. У адной сям'і была вельмі прыгожая маладая дзяўчына па імені Проня. Яе кахалі два маладыя цыганы. Ніяк дзяўчына не магла аддаць перавагу аднаму з іх, бо абодва былі добрыя хлопцы.

Ішоў час. Аднойчы Проня і два хлопцы прагульваліся па беразе ракі. Быў спякотны ліпеньскі дзень. Дзяўчына вырашыла скупнуцца. Яна скочыла ў ваду, трапіла ў вадаварот і затанула. Хлопцы кінуліся яе выратоўваць. Хаця і выцягнулі цела Проні, аднак прыкмет жыцця ў ім ужо не было. Апранулі на яе сукенку і пачалі галасіць: «Проня, Пронюшка, дарагая Пронюшка. Няхай гэтая рака назаўсёды будзе называцца Проняй».

Рака Проня працягласцю ў 172 кіламетры. Пачатак бярэ ў Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці. Перасякае Горацкі, Чавускі і паўночную частку нашага раёна. У горадзе Слаўгарадзе ўпадае ў раку Сож. На левым беразе Проні размешчаны вёскі Гіжэнскага сельсавета, а на правым — вёскі Харанеў, Улукі, Рабавічы, Красная Слабада, Завад Віравая.

На гэтай рэчцы мастоў не было, і толькі паромы перавозілі людзей з аднаго боку ракі на другі. Будаваліся часовыя масты, але ў час паводак яны здымаліся. Да трыццатых гадоў і нават пасля Вялікай Айчыннай вайны па рэчцы ганялі плыты з лясоў Чавускага і часткова нашага раёна ў Гомель.

Нямала адбылося на гэтай рацэ і ваенных падзей, якія яскравымі старонкамі ўпісаны ў гісторыю Слаўгарадчыны.

*П.Е.Кавалькоў.*

## Помнікі гісторыі і культуры Слаўгарадскага раёна[1]

**Вёска Азарычы, Лапаціцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. На могілках.

Гарадзішча ранняга жалезнага веку. За 1,5 км на захад ад вёскі, на левым беразе р. Раста.

**Вёска Аляксандраўка-1, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені 1941 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі.

Помнік артылерыстам. За 2 км на поўдзень ад вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі, у скверы.

Стаянка каменнага веку. За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе р. Сож.

Селішча эпохі Кіеўскай Русі. На месцы стаянкі.

**Вёска Бахань, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. У цэнтры вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Благадаць, Каменкаўскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 1,5 км на захад ад вёскі.

**Вёска Бязуевічы, Васькавіцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі восенню 1943 г. у баях супраць

[1]Звесткі друкуюцца паводле кнігі: Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць. Мн., 1986.




Карта помнікаў гісторыі і культуры Слаўгарадскага раёна.

нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. На могілках.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў ці памерлі ад ран. На могілках.

Магіла савецкага воіна, які загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Вёска Бярозаўка, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. У паўднёвай частцы вёскі.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. На могілках.

Магіла М.М.Грамокава, партызана палка «Трынаццаць», які загінуў 17.5.1943 г. На могілках.

Магіла Р.Л.Жалудзька, партызана палка «Трынаццаць», які загінуў 17.5.1943 г. На могілках.

Магіла Р.Загарэльскага, лейтэнанта Чырвонай Арміі, які загінуў 23.5.1942 г. На могілках.

Магіла Н.І.Кацярухінай, партызанкі палка «Трынаццаць», якая загінула 24.5.1943 г. На могілках.

Магіла С.Лупава, партызана палка «Трынаццаць», які загінуў 17.5.1943 г. пры разгроме нямецка-фашысцкага гарнізона ў Чавусах. На могілках.

Магіла А.П.Макарава, камандзіра роты партызанскага палка «Трынаццаць», які загінуў 17.5.1943. На могілках.

Магіла савецкага воіна, які загінуў у Вялікую Айчынную вайну. На могілках.

Помнік землякам, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

**Вёска Васькавічы, цэнтр сельсавета**

Гарадзішча. За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, на ўзвышшы правага берага р. Пясчанка, над яе старыцай.

Курганны могільнік радзімічаў (X – XII ст.). За 1 км на поўнач ад вёскі, на правым беразе р. Пясчанка, абапал дарогі, у лесе.

Магіла савецкага воіна, які загінуў у 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

**Вёска Вялікая Зімніца, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі восенню 1943 г. пры вызваленні




Каля помніка савецкім воінам у в. Бярозаўка.

раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

Магіла санітаркі палявога шпіталя, якая загінула ў 1943 г. у час аднаго з баёў за вызваленне тэрыторыі раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На паўднёвай ускраіне вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі, у скверы.

**Вёска Гайшын, Васькавіцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Сямёнаўка.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У скверы, каля школы.

Курганны могільнік. За 1,3 км на поўдзень ад вёскі, каля абрыву правага берага р. Сож, у лесе.

Курганны могільнік. За 2 км на поўдзень ад вёскі, абапал дарогі, у лесе.

Стаянка каменнага веку. На паўднёва-ўсходняй ускраіне вёскі, на правым беразе р. Сож.

Селішча. На месцы стаянкі.

Стаянка эпохі неаліту. За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Сож.

Селішча. На месцы стаянкі.

**Вёска Гіжэнка, цэнтр сельсавета**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. і ў 1943—1944 гг. ці памерлі ад ран у 1944 г. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі, каля лясніцтва.

Курганны могільнік. За 0,3 км на поўнач ад вёскі, у лесе.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля будынка выканкома сельсавета.

**Вёска Дубна, Каменкаўскі сельсавет**

Паселішча-1 эпохі неаліту і бронзавага веку. На заходняй ускраіне вёскі, на тэрасе левага берага р. Сож, ва ўрочышчы Ганчароўка.

Паселішча-2 эпохі неаліту і бронзавага веку. На паўночнай ускраіне вёскі, на левым беразе р. Сож, ва ўрочышчы Збішча.

Паселішча-3. На захад ад вёскі, на ўсходнім беразе воз. Святое, ва ўрочышчы Купальня.

**Вёска Дубраўка, былы Кульшыцкі сельсавет (адселена)**

Курганны могільнік. За 2 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе, па дарозе ў в. Кулікоўка.

**Вёска Жаролы, былы Кульшыцкі сельсавет (адселена)**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баі супраць нямецка-фашыскіх захопнікаў. На могілках.

**Вёска Завад-Віравая, Кабінагорскі сельсавет**

Курганны могільнік. За 2 км на поўнач ад вёскі, у лесе, каля абрыву правага берага р. Проня.

**Вёска Загліннае, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магіла Ц.Я.Зайкоўскага, партызана палка «Трынаццаць», які загінуў у 1943 г. За 1 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Даброжынка.

Магіла савецкага воіна, які загінуў у 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

**Вёска Закрупец, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На захад ад вёскі, ва ўрочышчы Дачкі.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Брацкія могілкі савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на р. Проня. За 1 км на захад ад вёскі.

Магіла С.К.Кірпічэнкавай, партызанкі палка «Трынаццаць», якая загінула 15.5.1943 г. За 1,5 км на захад ад вёскі, у лесе.

**Вёска Запалянне, былы Кульшыцкі сельсавет (адселена)**

Магіла савецкага воіна, які загінуў у 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

**Вёска Іванішчавічы, Лапаціцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1941—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Курганны могільнік. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі, на левым беразе р. Хацінка, каля будынка клуба.

Курган. За 0,5 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе.

**Вёска Казакоўка, Каменкаўскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

**Вёска Кліны, Каменкаўскі сельсавет (адселена)**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. На могілках.

Стаянка ранняга мезаліту (9—6-е тысячагоддзі да нашай эры). За 0,3 км на захад ад вёскі, на другой надпоймавай тэрасе левага берага р. Сож.

**Вёска Кулікоўка-1, былы Кульшыцкі сельсавет (адселена)**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія памерлі ў 1943 г. ад ран у шпіталі. У цэнтры вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Кулікоўка-2, былы Кульшыцкі сельсавет (адселена)**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. На могілках.

Курганны могільнік. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, у хваёвым бары, па дарозе ў в. Дубраўка.

**Вёска Кульшычы, Васькавіцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. Каля будынка праўлення калгаса імя А.А.Жданава.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 6 км на захад ад вёскі.

Магілы двух савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Курганаўка, Кабінагорскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі, каля аўтамабільнай дарогі Слаўгарад—Доўск.

**Вёска Лапацічы, цэнтр сельсавета**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. У цэнтры вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Лебядзёўка, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія ў 1943 г. памерлі ад ран у шпіталі. На паўднёвай ускраіне вёскі.

**Пасёлак Ліпнік, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

**Вёска Любаны, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкія могілкі савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На паўднёвай ускраіне вёскі.

Магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Загуменне.

**Вёска Лясная, Лапаціцкі сельсавет**

Брацкая магіла рускіх воінаў, якія загінулі 28.9.1708 г. у баі са шведскімі войскамі. На могілках.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Мемарыяльная капліца. Пабудавана ў пач. XX ст. У цэнтры вёскі.

Помнік у гонар перамогі рускіх войскаў у бітве пад Лясной. Пастаўлены ў 1908 г. У цэнтры вёскі.

**Вёска Ляцягі, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Каля будынка клуба.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 0,1 км на ўсход ад вёскі, у лесе.

Магіла М.Дз.Емяльянавай, партызанкі палка «Трынаццаць», якая загінула ў 1943 г. На могілках.

Магіла савецкага воіна П.А.Жураўлёва, які загінуў 13.10.1943 г. За 1,5 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Цяплёнка.

Магіла М.П.Кабанава, партызана палка «Трынаццаць», які загінуў у 1943 г. На могілках.

Магілы трох партызан палка «Трынаццаць», якія загінулі ў 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

**Вёска Машэцкая Слабада, Лапаціцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія памерлі ў 1944 г. ад ран у шпіталі. На могілках.

**Вёска Новая Слабада, Кабінагорскі сельсавет**

Брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магіла ахвяр фашызму. На могілках.

**Вёска Папоўка, Васькавіцкі сельсавет**

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі.

**Вёска Пацяраеўка, Лапаціцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму. За 1,7 км на захад ад вёскі, справа ад дарогі на в. Машэцкая Слабада.

Брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. і 1943 г. ці памерлі ад ран у шпіталях. На могілках.

Курганны могільнік. За 1 км на ўсход ад вёскі, на левым беразе р. Раста.

**Вёска Рабавічы, Лапаціцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран. На могілках.

Магіла Ф.Ф.Зайцава, гвардыі капітана Чырвонай Арміі, які загінуў у 1944 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магіла Героя Савецкага Саюза П.Ц.Панамарова, які загінуў 26.10.1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магілы трох савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

**Вёска Рабінаўка, Васькавіцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1944 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у шпіталі. За 0,3 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Шмат.

**Вёска Рагі, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі восенню 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у шпіталі. На могілках.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля будынка клуба.

**Вёска Ржаўка-1, Васькавіцкі сельсавет**

Магіла лейтэнанта Чырвонай Арміі, які загінуў у 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 50 м на паўднёвы ўсход ад вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Рудня, Васькавіцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Помнік Герою Савецкага Саюза В.І.Ча-

мадураву, які вызначыўся 12.10.1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 2 км на захад ад вёскі, каля шашы Слаўгарад – Доўск.

Стаянка бронзавага веку. За 0,1 км на ўсход ад вёскі, на мысе пры ўпадзенні р. Пясчанка (на яе правым беразе) у р. Сож (на яго правым беразе).

Стаянка эпохі неаліту. За 0,2 км на поўнач ад вёскі, на мысе пры ўпадзенні р. Пясчанка (на яе левым беразе) у р. Сож (на яе правым беразе).

Стаянка і селішча. За 1,5 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Сож, на полі і ў лесе.

Стаянка каменнага веку. За 1,7 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Сож.

Селішча. На месцы стаянкі.

**Вёска Рудня, Гіжэнскі сельсавет**

Магіла сяржанта Чырвонай Арміі А.Ф.Батурына, які загінуў у кастрычніку 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

Магіла капітана А.П.Гуляева, які загінуў 23.10.1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 1 км на паўночны захад ад вёскі, у лесе.

**Вёска Рэкта, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Свенск, цэнтр сельсавета**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля будынка выканкома сельсавета.

Парк. Закладзены ў пачатку XX ст. У паўднёва-ўсходняй частцы вёскі.

**Вёска Сіліна Поле, Кабінагорскі сельсавет**

Стаянка-1. За 1,5 км на ўсход ад вёскі, у пойме правага берага р. Сож, на дзюне.

Стаянка-2. За 1,3 км на ўсход ад вёскі, у пойме правага берага р. Сож, на дзюне.

**Вёска Слаўня, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у шпіталі. На могілках.

Курганны могільнік. За 1,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, на левым забалочаным беразе р. Пацэя, у лесе.

**Вёска Старая Каменка, цэнтр Каменкаўскага сельсавета**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях за вызваленне раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

Стаянка-1 эпохі неаліту. За 0,5 км на захад ад вёскі, на паўднёва-ўсходнім беразе возера Дрышчаўскае (левабярэжжа р. Сож).

Стаянка-2 эпохі мезаліту. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Рубанаў Курган, на пясчаных узвышшах поймы левага берага р. Сож.

Стаянка-3 эпохі неаліту і бронзавага веку. За 1 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Башарына Поле (Чорная Гразь).

Стаянка-4 эпохі неаліту. На пясчанай грыве, у пойме каля возера Саснавец.

**Вёска Старынка, былы цэнтр сельсавета (адселена)**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баях супраць нямецка-фашыскіх захопнікаў. У цэнтры вёскі.

Магіла лейтэнанта Чырвонай Арміі А.В.Чарухіна, які загінуў у 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 1,5 км на ўсход ад вёскі.

**Вёска Улукі, Ланаціцкі сельсавет**

Магіла старшага лейтэнанта Чырвонай Арміі П.І.Іванова, які загінуў у 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магіла жыхаркі вёскі Д.Ф.Цімашковай, загубленай нямецка-фашысцкімі захопнікамі 23.8.1943 г. На могілках.

**Вёска Усохі, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія памерлі ў 1943 г. ад ран у шпіталі. На могілках.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Магіла савецкага воіна, які загінуў у 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі, на ўзлессі.

**Вёска Ходараў, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў ці памерлі ад ран у шпіталі. За 0,2 км на паўднёвы захад ад вёскі, у лесе.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія памерлі ў 1943 г. ад ран у шпіталі. На могілках.

Магіла капітана Я.І.Ярмілава, які загінуў 27.11.1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 0,2 км на паўднёвы захад ад вёскі, на ўзлессі.

**Вёска Целяшы, Гіжэнскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Брацкія магілы савецкіх воінаў, якія памерлі ў 1943 г. у шпіталі ад ран. За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Запруддзе.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Каля будынка праўлення калгаса.

**Вёска Чарнякоўка, Свенскі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У цэнтры вёскі.

**Вёска Чырвоная Слабада, Лапаціцкі сельсавет (адселена)**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1943—1944 гг. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў за вызваленне раёна. На могілках.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў канцы 1943 г. у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На могілках.

Гарадзішча мілаградскай культуры. Мясцовая назва Гарадзец. За 1 км на поўнач ад вёскі, на правым беразе р. Проня.

Курганны могільнік. На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, на сядзібах.

Курганны могільнік радзімічаў (XI ст.). За 2 км на поўнач ад вёскі, у лесе.

Магіла старшага лейтэнанта Чырвонай Арміі Дз.І.Дзямідава, які загінуў 13.11.1943 г. у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 0,1 км на поўнач ад вёскі, у лесе.

**Вёска Чырвоны Усход (Шаламы-1), Васькавіцкі сельсавет**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1941 г. і пры вызваленні раёна ў 1943 г. У цэнтры вёскі.

Помнік землякам, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У заходняй частцы вёскі, каля будынка клуба.

**Горад Слаўгарад**

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і 1943 г. Вуліца Ленінская, у парку.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў ліпені 1941 г. На паўднёва-заходняй ускраіне горада, каля аўтамабільнай дарогі Слаўгарад—Рагачоў.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. у баях за вызваленне горада. На тэрыторыі школы-інтэрната.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, якія памерлі ў 1943—1944 гг. ад ран у шпіталях. На могілках.

Брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941 г. і 1943 г. За 8 км на паўночны ўсход ад горада, каля аўтамабільнай дарогі Слаўгарад—Магілёў.

Брацкая магіла ахвяр фашызму. На паўднёвай ускраіне горада. У 1943 г. тут былі расстраляны 30 вернікаў-сектантаў («штундаў»).

Будынак царкоўнапрыходскай школы. Пабудаваны ў канцы XVIII ст. Вуліца Ленінская, 2.

Гарадзішча. Каля вусця р. Проня, на правым беразе р. Сож, у гарадскім парку. Вядома пад назвай Замкавая Гара.

Жылы дом. Пабудаваны ў пачатку XX ст. Вуліца Ленінская, 34.

Курганны могільнік эпохі Кіеўскай Русі (XII—XIII ст.). За 5 км на паўночны ўсход ад горада, на левым беразе р. Проня, абапал дарогі, у лесе, каля ўсходняга берага возера Узмутнае.

Паштовая станцыя. Пабудавана ў 2-й палове XIX ст. Вуліца Ленінская, 49а.

Стаянка, селішча. За 1 км на ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня.

Стаянка каменнага веку. За 1,3 км на ўсход ад горада, у пойме правага берага р. Сож, пры ўпадзенні ў яе р. Проня, на дзюне.

Селішча. На месцы стаянкі.

Стаянка каменнага веку. За 3,5 км на паўночны ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня, на дзюне.

Селішча эпохі Кіеўскай Русі. На месцы стаянкі.

Стаянка-1. За 1 км на ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня, на дзюне.

Стаянка-2. За 1,1 км на ўсход ад горада, у пойме левага берага р. Проня, на дзюне.

Стаянка-3. За 1,2 км на ўсход ад горада, у пойме правага берага р. Сож, пры ўпадзенні ў яе р. Проня, на дзюне.

Царква Раства Багародзіцы. Пабудавана ў 1791 – 1793 гг. У цэнтры горада.

* * *

Помнік у гонар 50-годдзя вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ансамбль каменных пірамід, у цэнтры якога стэла з мемарыяльнай дошкай. Адкрыты 25 лістапада 1993 г.

Алея памяці чарнобыльскай бяды, дзе ўстаноўлена 11 стэл з назвамі вёсак. У цэнтры — камень з мемарыяльнай дошкай, дзе гаворыцца, што парк закладзены ў памяць аб адселеных вёсках у год дзесяцігоддзя Чарнобыльскай катастрофы.

Мемарыяльны камень на ўшанаванне памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. У скверы 80-годдзя ВЛКСМ.

## З гісторыі населеных пунктаў Слаўгарадчыны

**АДАМІН,** былы фальварак, потым хутар у Кульшыцкім сельсавеце. З 1910 г. фальварак належаў двараніну Ф.К.Крукоўскаму, 1 двор, 4 жыхары. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**АДАМІНА,** былы маёнтак у Кульшыцкім сельсавеце. З 1908 г. маёнткам валодаў памешчык Крукоўскі. Зліўся з в. Кульшычы.

**АЗАРЫЧЫ,** вёска ў Лапаціцкім сельсавеце. Упершыню згадваецца ў інвентары Дубровенскім за 1560 г. На карце 1777 г. адзначаны Азарычы і вадзяны млын. У метрыцы Прапойскай царквы Раства Багародзіцы за 1859 г. зафіксавана в. Азарыч. У 1873 г. у Даўгамохскай воласці Быхаўскага павета, меўся хлебазапасны магазін. У 1877 г. пабудавана мураваная Троіцкая царква. У 1910 г. належала Устаненскаму сельскаму таварыству; 38 двароў, 267 жыхароў, у 1926 г. 420 жыхароў, чатырохкласная школа.

**АЗЕРСКА,** былое лясніцтва ў Гіжэнскім сельсавеце. У 1926 г. 10 жыхароў.

**АЗЯРЭЦ,** былы пасёлак у Гіжэнскім сельсавеце. На р. Гіжэнка. Мелася ставок, млын, крупадзёрка. Цяпер вуліца ў в. Гіжэнка. Іншыя назвы *Вазярэц, Вызярэц, Зярэц.*

**АЛЕЕЎШЧЫНА,** былы хутар у Кульшыцкім сельсавеце. На захад ад в. Кульшычы. У 1910 г. 10 двароў, 50 жыхароў. Адносіўся да Кульшыцкага праваслаўнага прыхода. Цяпер урочышча.

**АЛЕКСАНДРОЎКА,** былая вёска ў Васькавіцкім сельсавеце. Мясцовая назва *Ліксандраўка*. Цяпер вуліца Паўлючонкава ў в. Шаламы-1.

**АЛЕКСАНДРЫЯ,** былы фальварак у Баханскім сельсавеце. У 1910 г. быў 1 двор. Адносіўся да Журавіцкага рымска-каталіцкага прыхода.

**АЛЯКСАНДРАЎКА,** былая вёска ў Слаўгарадскім гарсавеце. Каля в. Курганаўка. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. зямля Аляксандраўкі была сумежная з в. Шаламы і с. Міхайлоўскае.

**АЛЯКСАНДРАЎКА,** былы фальварак у Гіжэнскім сельсавеце каля р. Сож. Належаў двараніну В.А.Судзілоўскаму. У 1910 г. 61 жыхар. Адносіўся да Азёрскага праваслаўнага прыхода.

**АЛЯКСАНДРАЎКА-1,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. Мясцовыя назвы *Аліксандруўка, Ліксандруўка, Ліксандрыўка, Таўкачоўка, Малінаўка*. У 1750 г. 12 двароў, у 1884 г. 40 двароў, з іх 4 сталярныя, 189 жыхароў. У 1910 г. у Даўжанскай воласці Чэрыкаўскага павета, належала Аляксандраўскаму сельскаму таварыству; 46 двароў, 303 жыхары. Адносілася да Азёрскага праваслаўнага прыхода. У 1926 г. у вёсцы 427 жыхароў, чатырохкласная школа.

**АЛЯКСАНДРАЎКА-2,** вёска ў Гіжэнскім сельсавеце. У 1910 г. фальварак Аляксандраўка належаў дваранцы Рамідоўскай; 1 двор, 9 жыхароў. Адносіўся да

19. Зак. 4744